


ШКОЛЬНЫ БУЛІНГ: АДЗІН СУПРАЦЬ УСІХ

ЧЫРВОНКА

НА МАТАЦЫКЛЕ ПА КРАІНАХ І КАНТЫНЕНТАХ

ЧЫРВОНКА



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

26 САКАВІКА 2020 г. ЧАЦВЕР № 59 (29173)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Маргарыта ПАЧЫЦКАЯ, начальнік аддзела арэнды жылля агенцтва нерухомасці «Твая сталіца»:**

*«Традыцыйна ў пачатку сакавіка актывізуюцца арандатары загараднага жылля на летні перыяд, але сёлетняй вясной арандатараў стала яшчэ больш. Сёння да кліентаў, якія шукаюць дом на лета для сябе і сваёй сям'і, дадаліся і тыя, хто сур'ёзна разглядае загарад як месца для самаізаляцыі. Летась асаблівага ўсплёску попыту на арэнду загараднай нерухомасці не назіралася. І калі параўнаць першы квартал 2019-га з аналагічным перыядам 2020 года, то можна смела сказаць, што попыт узрос на 30 %».*

# ГАРАЖ ШМАТПРОФІЛЬНАГА ПРЫЗНАЧЭННЯ



У сталічнага жыхара Андрэя БЕГУНА шмат цікавых захапленняў. Я ведаю яго як апантанага вандроўніка-экстрэмала, які разам з сябрамі ладзіць далёкія шматдзённыя аўтападарожжы на Байкал, Каўказ. Ён аб'ехаў ці не палову суседкі-Расіі. Часта жыццярадасны мінчанін прападае ў гаражы, бо тут у яго створана сапраўдная майстэрня. Андрэй любіць канструяваць новыя механізмы і агрэгаты, яму падабаецца рамантаваць старую тэхніку і бытавыя прыборы, мадэрнізаваць для цяжкадаступных дарог транспарт — пазадарожнікі і звычайныя ровары. Нездарма ж кажуць: не кармі майстра хлебам, а дай папрацаваць!

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

## КОРАТКА

- Мінфін гатовы прыняць меры для захавання ўстойлівасці бюджэту на фоне сітуацыі з COVID-19 і цэнамі на нафту.
- **У Лепельскім раёне сабралі зямлю з воінскіх пахаванняў у агульную капсулу.**
- Памерла актрыса Іна Макарава.



- **Кіраўнікі ЕС заклікалі захаваць адкрытымі ўнутраныя граніцы для перамяшчэння тавараў.**
- Белдзяржцырк адмяняе прадстаўленні.

Супрацоўніцтва

# ЯК ВЕДАЛІ...

### Эпідэміі прыходзяць і сыходзяць, а інфекцыяністам заўсёды трэба быць напагатове

**Цяперашняя пандэмія яшчэ раз нагадала і медыкам, і ўладным структурам, і нам усім, як важна супрацоўнічаць дзяржавамі не толькі ў галіне эканомікі, але і ў галіне аховы здароўя. Свет цяпер надзвычай рухомы, людзі перасоўваюцца, а з імі перамяшчаюцца інфекцыі і вірусы, для якіх граніцы не існуюць нагул. Таму вельмі важным бачыцца стан здароўя насельніцтва ў пагранічны. А ён залежыць ад многіх фактараў. Сярод іх можна назваць аснашчанасць устаноў аховы здароўя, падрыхтаванасць медыцынскага персаналу, абмен інфармацыяй і шмат іншых.**

Пра асаблівасці дыягностыкі і лячэння гепатыту С, ВІЧ/СНІД, іншых вірусных інфекцый ішла гаворка на семінары-трэнінгу, які правяла Брэсцкая абласная клінічная бальніца ў рамках праграмы беларуска-польскага супрацоўніцтва. Канферэнцыя вызначылася тым, што яе не адмянілі, як многія мерапрыемствы, а правялі ў раней прызначаны дзень. Пры рэгістрацыі ўдзельнікам прапаноўвалі скарыстацца антысептыкам, а крэслы ў зале пасяджэння стаялі не шчыльна, а на пэўнай адлегласці. У астатнім семінар праходзіў як звычайна. Урачы абласной бальніцы дзяліліся ведамі са сваімі калегамі з раённых цэнтраў, гарадскіх бальніц і паліклінік.

СТАР. 2

Жыві і квітней, Беларусь! Наш дом

# ПЛЯЧО ДЛЯ НЯДБАЙНЫХ БАЦЬКОЎ

### Як маладая сям'я гадуе дзяцей у новым доме

**Двухпавярховы асабняк, куды нядаўна засялілася шматлікая сям'я, доўга шукаць не давялося. Па-першае, гэта цэнтр горада, а па-другое, такіх дамоў тут некалькі. Чацвёрты па ліку адкрыты ў канцы мінулага года. А насяляюць яго аж но 10 чалавек — двое бацькоў і васьмёра дзяцей.**



СТАР. 13

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Вы яшчэ паспяваеце падпісацца на «Звязду» на ІІ квартал

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА